Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 МАЯ 2017 г. ПЯТНІЦА № 84 (28448)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Крэдыты без даведкі аб даходах

СТАР. 4



Як залячыць душэўныя раны

СТАР. 16



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЯРАШЭНКА, кіраўнік адміністрацыі індустрыяльнага парка «Вялікі камень»:**

*«Сёлета «Вялікі камень» будзе развівацца па формуле 20—10—5. Мы ставім перад сабой задачу, каб па выніках 2017 года ў парку зарэгістравалася не менш за 20 рэзідэнтаў (на гэты момант у нас іх дзевяць). Дзесяць рэзідэнтаў — гэта тыя, хто не проста зарэгіструецца, але і пачнуць будаваць свае вытворчыя аб'екты. Акрамя таго, у парку чакаюць, што пяць аб'ектаў у гэтым годзе ўжо будуць пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.05.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8834 | ▲ |
| Еўра | 2,0517 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0711 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ДАВЯРАЛЬНАЕ, УСЕБАКОВАЕ, СТРАТЭГІЧНАЕ...

## Сакрэт поспеху беларуска-кітайскага супрацоўніцтва



**Падзею, якая ўчора адбылася ў Палацы Незалежнасці, Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка назваў гістарычнай. Упершыню да нас завітала такая вялікая група кітайскіх журналістаў — у рамках прэс-тура. Ключавой яго кропкай стала прэс-канферэнцыя беларускага лідара сродкам масавай інфармацыі Паднябеснай. Пытанні былі сур'ёзныя і закранаці як у цэлым двухбаковае супрацоўніцтва, так і розныя яго кірункі.**

### Калі свет становіцца непрадказальным...

У Беларусь прыехалі прадстаўнікі цэнтральных і рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі Кітайскай Народнай Рэспублікі. Звыш 40 журналістаў прадстаўляюць 28 друкаваных і электронных сродкаў масавай інфармацыі Паднябеснай.

— Ведаю, што вы знаходзіцеся ў Беларусі некалькі дзён, і ўжо паспелі трошкі пазнаёміцца з нашай краінай, даведацца пра яе эканамічны, культурны, навуковы патэнцыял, атрымаць уяўленне аб характары, традыцыях Беларусі, — сказаў кіраўнік краіны напачатку размовы. — Гэта першая наша з вамі сустрэча ў такім фармаце, і яе важнасць абумоўлена шэрагам прычын.

Першая — сёлета Беларусь і Кітай адзначаюць 25-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін. Сустрэча кітайскіх журналістаў з беларускім лідарам — значнае мерапрыемства юбілейнага года.

— Сусветная эканоміка і палітыка, на жаль, сталі непрадказальнымі, — канстатаваў Прэзідэнт. — Але насуперак сусветным выклікам Беларусь і Кітай стварылі моцныя, трывалыя і надзейныя міждзяржаўныя сувязі, адносіны даверальнага, усебаковага, стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Відаць, не знойдзецца ў Еўропе больш блізкай для Кітая краіны, чым Беларусь. Мы дасягнулі значных рэзультатаў і ў палітыцы, падтрымліваючы адзін аднаго ў міжнародных арганізацыях, і ў эканоміцы. Мы разам ствараем Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк, рэалізавалі дзясяткі інвестыцыйных праектаў у энергетыцы, будаўніцтве. У гуманітарнай сферы ідзе абмен студэнтамі, развіваецца супрацоўніцтва ў галіне навукі, турызму.

Другая прычына, чаму сустрэча носіць асаблівы характар — прэс-тур арганізаваны спецыяльна напярэдадні саміта «Адзін пояс і адзін шлях», у якім прыме ўдзел і Беларусь. Падчас форуму запланавана асабістая сустрэча Прэзідэнта Беларусі і Старшыні КНР. На ёй лідары абмяркуюць як міжнародны парадак дня, так і развіццё двухбаковага ўзаемадзеяння. Трэцяя прычына, якую назваў Прэзідэнт, — прыезд кітайскіх журналістаў яшчэ раз падкрэслівае важнасць супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі Беларусі і Кітая, бо менавіта там знаходзяцца асноўныя рэзервы ўзаемадзеяння.



Фота БЕЛТА.

### «Знаёміліся» доўга

Журналіст Цэнтральнага тэлебачання Кітая (CGTN) пацікавіўся, як беларускі лідар ацэньвае ўзровень беларуска-кітайскіх адносін і якой бачыцца яму іх будучыня. Аляксандр Лукашэнка расказаў, з чаго пачыналася цяперашняе ўзорнае сяброўства:

— Калі я яшчэ быў дэпутатам парламента, яшчэ да прэзідэнцтва, я бываў у КНР. Тады на ўвесь свет Кітай славіўся сваімі свабоднымі эканамічнымі зонамі — як дзяржава, якая развіваецца. І нам, пасля распаду Савецкага Саюза трэба было неяк аднаўляць эканоміку Беларусі. Трэба было, калі казаць прама, ратаваць дзяржаву. А ратаваць дзяржаву можна толькі ратуючы эканоміку. Тады, каб вывучыць рэжым функцыянавання гэтых свабодных эканамічных зон, падаткавы рэжым, урадавая дэлегацыя, і я быў у яе ліку, накіравалася ў КНР.

СТАР. 2

■ Памяць

# Па слядах батальёна капітана Уладзімірава

## Пад Магілёвам упершыню вяліся раскопкі на месцы, дзе на пачатку вайны насмерць стаялі міліцыянеры



Фота Мікалая БАРЫСЕНКІ.

Адзінае пахаванне на вышыні капітана Уладзімірава зроблена 25 гадоў таму (тут ляжаць астанкі 29 міліцыянераў і чырвонаармейцаў, што загінулі ў 41-м).

**Ад абласнога цэнтра да гэтай безыменнай вышыні каля вёскі Гаі ўсяго некалькі кіламетраў. З дарогі відаць манумент у гонар мужных абаронцаў батальёна міліцыі, якім камандаваў капітан Канстанцін Уладзіміраў. Па некаторых звестках, з 250 міліцыянераў, сярод якіх былі выкладчыкі і курсанты магілёўскай, мінскай і гродзенскай школ міліцыі, выратаваліся толькі 19. Але гэтыя лічбы дагэтуль выклікаюць у гісторыкаў спрэчкі. Пакуль няма пацвярджальных дакументаў. Упэўнена сцвярджаць можна толькі адно: міліцыянеры трымаліся да апошняга.**

Магілёўскі інстытут МУС вось ужо некалькі гадоў займаецца пошукамі звестак пра сваіх мужных калег. Раскопкі на вышыні, дзе, як мяркуецца, змагаўся батальён, праводзіліся упершыню за ўсю пасляваенную гісторыю. Знайшліся некалькі сведак, якія на час вайны былі дзецьмі і ўсё бачылі на свае вочы. **Жыхар вёскі Засценкі Мікалай СЛЯПНЁЎ,** якому ў 41-м было 14 гадоў, паказаў траншэю, дзе ён з аднасяльчанамі пахаваў некалькіх міліцыянераў. «На іх былі сінія шынялі», — удакладніў ён. Яго аднагодка **Соф'я ВЕРАКСА, жыхарка вёскі Гаі,** у пахаванні не ўдзельнічала, але бачыла апошні бой.

— Раптоўна грымнула «ўра», і людзі ў сініх шынялях пабеглі ў атаку, — расказала жанчына. — Немцы адкрылі агонь. Адзін салдацік упаў, другі. Усяго я налічыла 8. Было вельмі спякотна, але немцы дазволілі хаваць забітых толькі на чацвёрты дзень.

Да пошукавых работ у Магілёве падрыхтаваліся грунтоўна. Упраўленне ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама паклапацілася, каб забяспечыць на месцы раскопак ахову правапарадку і дапамагло з міні-экскаватарам. Побач з ваеннымі 52-га спецыялізаванага батальёна працавалі курсанты інстытута МУС і пошукавікі Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «ВІККРУ». Але вынікі пошукаў, на жаль, сціплыя. Знойдзены астанкі аднаго байца, хутчэй за ўсё 394-га стралковага палка 110-й тульскай дывізіі. Гэты полк размяшчаўся якраз па суседстве з батальёнам міліцыі. Побач з астанкамі салдата ляжалі дзве вінтоўкі, якія знаходзіліся на ўзбраенні тулякоў. Ды і сіняга шыняля, як у міліцыянераў, не было. Знойдзены таксама металічны медальён. Ён перададзены на экспертызу, але знаўцы не вельмі спадзяюцца на ўдачу. За столькі гадоў усё, што знаходзіцца ўнутры, маглоператварыцца ў крохкі кавалак іржавага жалеза. Пластмасавыя медальёны ў гэтым сэнсе больш надзейныя.

СТАР. 4

# По слядах батальёна капітана Уладзімірава

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Асноўныя знаходкі — савецкія і нямецкія гільзы, патроны, асколкі снарадаў. Немцы былі паслядоўнымі ў вядзенні бою: авіяцыя, артылерыя, мінамёты, пяхота. Батальён міліцыі супрацьстаяў гэтай браніраванай моцы стралковай зброяй — пісталетамі, наганамі, вінтоўкамі. Але ў міліцыянераў быў вялікі запас мужнасці і стойкасці.



Мемарыял у гонар капітана Канстанціна Уладзімірава і яго мужнага батальёна.

На месцы былых баёў сёння пералесак. Пра гарачае лета 41-га нагадвае толькі абеліск. Але зямля тут звініць ад металу. Для многіх курсантаў МУС, аднагодкаў тых, хто стаяў тут насмерць у ліпені 41-га, гэта першая вахта. Іван Маручак шмат чаго чуў пра вайну з вуснаў дзеда. Цяпер вось сам дакрануўся да ваеннай гісторыі, ацаніў, наколькі страшнымі былі баі. Уладзіслаў Есьман таксама добраахвотнік. Яго прадзед ваяваў на Палессі. Невялікі вопыт у пошукавай справе ў юнака ўжо ёсць: прымаў удзел у раскопках у Гомельскай вобласці. «Для нашых курсантаў удзел у пошукавых работах — гэта свайго роду школа патрыятызму, магчымасць непасрэдна дакрануцца да падзей часоў Вялікай Айчыннай вайны», — кажа **намеснік начальніка інстытута па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні палкоўнік міліцыі Дзмітрый ПАНУЖДАЕЎ.** Сам палкоўнік над аднаўленнем гісторыі міліцыі працуе ўжо не першы год. Як вынік гэтага — дзве напісаныя ў суаўтарстве кнігі, вялікі досвед работы з першакрыніцамі ў архівах.

Белых плям у гісторыі міліцыі ўсё яшчэ шмат. У тым ліку і па батальёне міліцыі.

— Не захавалася ніводнага дакумента, усё пакрыта легендамі. Толькі рэдкія супярэчлівыя ўспаміны і справаздача 7-й мюнхенскай пяхотнай дывізіі пра тое, што 21 ліпеня 1941 года ўзята добрае ўмацаванне рускіх, — расказвае **ваенны пісьменнік, краязнаўца, кіраўнік клуба ВІККРУ Мікалай БАРЫСЕНКА.** — Спісу асабістага складу батальёна міліцыі няма, паколькі міліцыянеры і супрацоўнікі НКУС былі засакрэчаныя. Батальён быў сфарміраваны 11 ліпеня 1941-га года па вусным загадзе начальніка Магілёўскага гарнізона палкоўніка Ваяводзіна ў дапамогу 172-й стралковай дывізіі, якая абараняла горад. Людзі былі зведзены ў адно падраздзяленне, часу знаёміцца ў іх не было. На сёння дакладна вядомыя імёны толькі 39 байцоў батальёна.

Пошукавікі не хаваюць расчаравання — спадзяванні на тое, што атрымаецца знайсці астанкі загінулых міліцыянераў, былі вялікія. А сведка ваенных часоў Мікалай Сляпнёў, які быў упэўнены на ўсе сто ў тым, што не памыляецца з месцам пахавання, нават плакаў. Але затрымлівацца болей чым на 4 дні ў 52-га спецыялізаванага батальёна, без якога нельга весці раскопкі, магчымасці не было. У іх і так кожны дзень распісаны па графіку. «З Магілёва едзем у Оршу, там у нас два аб'екты, а потым у іншыя месцы. І так па 31 кастрычніка», — паведаміў **старшы лейтэнант 52-га спецыялізаванага батальёна Дзмітрый КАМІНСКІ.**



Пошукавікам пашчасціла знайсці астанкі толькі аднаго байца.

Але нічога не бывае выпадковым, лічыць Дзмітрый Пануждаеў. «Для нас адкрыліся новыя абставіны, — кажа ён. — Магчыма, што адбылася памылка і пошукі трэба весці на суседняй вышыні. За 70 гадоў змяніўся рэльеф мясцовасці, і сёння цяжка казаць пра нешта з упэўненасцю. Мы будзем працягваць займацца пошукамі. Не выключана, што наступны раз нам болей пашчасціць».

Мікалай Барысенка таксама спадзяецца, што некаторыя таямніцы ў гісторыі з батальёнам міліцыі ўсё ж такі ўдасца рассакрэціць. Магчыма, пашчасціць здабыць нямецкі аэрафотаздымак вышыні на сярэдзіну ліпеня 41-га. Тады ўсё будзе зразумела. «Я ведаю дакладна, што ў амерыканскіх архівах такія здымкі ёсць. Каштуюць яны да 100 долараў, але, калі справа датычыцца захавання памяці, думаць пра грошы нават непрыстойна», — кажа гісторык.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*



Фота Мікалая БАРЫСЕНКІ.

Побач з пошукавікамі працавалі і курсанты Магілёўскага інстытута МУС.

## ■ Віншаванні да свята

# Адпраўце вестачку ветэрану

Акцыю да Дня Перамогі запусціла «Белпошта»

**Ахвотныя змогуць падпісаць паштовыя карткі ў адрас ветэранаў са словамі ўдзячнасці. На бланках ужо пазначаны прозвішчы і месцы жыхарства былых байцоў. Святочныя вестачкі з віншаваннямі супрацоўнікі «Белпошты» даставяць ветэранам бясплатна.**

Прамамерапрыемства пройдзе ў выдзеленых аддзяленнях сувязі па ўсёй рэспубліцы. У Мінску акцыя адбудзецца 5 мая з 15.00 да 16.00. У гэты ж дзень святочныя карткі можна будзе падпісаць у аддзяленнях Гродзенскага філіяла (з 10.00 да 13.00), Віцебскага (з 11.00 да 12.00), Магілёўскай і Мінскай абласцей (з 14.00 да 15.00), у Гомелі (на вул. Савецкая, 8, з 14.00 да 15.00). Наведвальнікам Брэсцкага філіяла пошты далучыцца да віншаванняў прапануюць 6 мая з 10.30 да 12.30. Больш падрабязна пра месцы правядзення акцыі можна даведацца на сайце прадпрыемства і ў аддзяленнях сувязі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

## ■ Фінансы

# Пазычыць стане прасцей?

Рэгулятар дазволіў банкам выдаваць крэдыты без даведкі аб даходах

**Менавіта з першых дзён мая ўжо больш не дзейнічае пастанова Праўлення Нацыянальнага банка краіны №253, якая забараняла фінансавым інстытутам крэдытаваць фізічных асоб без дакумента, які пацвярджае атрыманне даходу. Нацбанк не стаў працягваць тэрміны дзеяння гэтага дакумента, таму цяпер банкі самастойна вызначаюць падыходы да ацэнкі крэдытаздольнасці сваіх кліентаў.**

**Слушны каментарый ад фінансавых аналітыкаў кампаніі ТэлетрэйдБел:**

— Спажывецкае крэдытаванне дапамагае аднаўленню ўнутранага попыту, які, у сваю чаргу, з'яўляецца адным з рухавікоў эканамічнага росту. Таму такая мера рэгулятара можа спрыяць паляпшэнню дынамікі ВУП Беларусі. Хутчэй за ўсё, цяпер зноў стануць папулярнымі так званыя крэдыты на тавары, якія выдаюцца непасрэдна ў крамах на буйныя пакупкі. Адсутнасць папяровай цяганіны разам са зніжэннем працэнтных ставак па крэдытах падштурхне попыт беларусаў на дарагія тавары. Акрамя таго, адмена абавязковых даведак аб даходах выдатна ўпісваецца ў агульную карціну лібералізацыі фінансавага рынку Беларусі, якая назіраецца апошнім часам, і пашырае магчымасці банкаў па развіцці дыстанцыйнага банкінгу.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

## ОТЧЕТ О ПРОВЕДЕНИИ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ПОКУПКА УДАЧИ»

**Место и дата составления отчета:**
03.05.2017 г.
г. Минск, пр. Независимости, 11/2, офис 328

1. Организатор: Общество с ограниченной ответственностью «ТриВижн» (далее Организатор), 220030, г. Минск, пр. Независимости, 11/2, офис 328, УНП 190624910.
2. Наименование рекламной игры – «Покупка Удачи».
3. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры №2921, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь от 25.01.2017 г.
4. Срок начала рекламной игры: 01 февраля 2017 г.
Срок окончания рекламной игры: 19 мая 2017 г.
5. Количество участников рекламной игры: 4 328 человек.
6. Розыгрыш проводился 10.04.2017 г. в 10.00 по адресу: РУП «Отель «Минск», г. Минск, пр. Независимости, 11/2, конференц-зал, в присутствии утвержденной комиссии из пяти человек:
Председатель Комиссии: Носик Дмитрий Викторович, директор ООО «ТриВижн».
Члены комиссии:
Алехно Наталья Вячеславовна, заместитель директора ООО «ТриВижн»;
Лешко Диана Валерьяновна, юрисконсульт ООО «ТриВижн»;
Врублевская Ольга Александровна, главный бухгалтер ООО «ТриВижн»;
Суходолова Татьяна Михайловна, главный специалист Управления информационной политики ОАО «Белгазпромбанк».
7. Призовой фонд рекламной игры «Покупка Удачи» состоял из:

| № п/п | Наименование призов, участвующих в розыгрыше | Сумма за 1 ед., бел. руб. | Сумма всего, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль SKODA RAPID ACTIVE 1.6MPi/66 kW, седан, Белый, кузов №XW8AG1NH9HK108271 | 20 043,4 | 23 023,60 |
| | Денежное вознаграждение | 2 980,20 | |
| 2 | Автомобиль SKODA RAPID ACTIVE 1.6MPi/66 kW, седан, Белый, кузов №XW8AG1NH0HK104366 | 20 043,4 | 23 023,60 |
| | Денежное вознаграждение | 2 980,20 | |

Призовой фонд разыгран полностью.
8. Победители рекламной игры:
**1. Корончик Ольга Николаевна, г. Волковыск.** Выигрыш: Автомобиль SKODA RAPID ACTIVE 1.6MPi/66 kW, седан, Белый, кузов №XW8AG1NH9HK108271 – 1 шт. и денежное вознаграждение в размере – 2 980,20 белорусского рубля. Дата выдачи выигрыша 20.04.2017 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2;
**2. Володина Наталья Владимировна, г. Могилев.** Выигрыш: Автомобиль SKODA RAPID ACTIVE 1.6MPi/66 kW, седан, Белый, кузов №XW8AG1NH0HK104366 – 1 шт. и денежное вознаграждение в размере – 2 980,20 белорусского рубля. Дата выдачи выигрыша 20.04.2017 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2.
9. Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: +375 17 209-90-03.
10. В ходе проведения рекламной игры нарушений допущено не было. Жалоб организатору и комиссии не поступало.


Утерянную зачетную книжку БГАТУ №1208004 Виталева Д.В. считать недействительной.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ТОРГАХ (в форме аукциона)

**Городокский районный исполнительный комитет Витебской области 9 июня 2017 года в 14.00 в здании Городокского райисполкома, расположенного по адресу: Витебская область, г. Городок, ул. Пролетарская, 2 (малый зал, каб. 110), проводит торги в форме аукциона на право заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства (длиннопалого (узкопалого) рака (Astacus leptodactylus) на территории следующих водных объектов Городокского района Витебской области:**

| Наименование водоема | Местонахождение, площадь, га | Промысловый запас, предельно допустимый объем изъятия рака | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| озеро Берново | 22 км на северо-запад от г. Городка, дер. Вировля, 280,0 га | 1960 кг, 882 кг | 460 рублей (20 базовых величин) | 230 рублей (50% начальной цены предмета аукциона |
| озеро Первище-Среднее | 6 км на юг от г. Городка, дер. Малые Стайки, 61,0 га | 427 кг, 192 кг | 460 рублей (20 базовых величин) | 230 рублей (50% начальной цены предмета аукциона |
| озеро Залешно | 38 км на северо-восток от г. Городка, дер. Гуколы, 39,0 га | 273 кг, 123 кг | 460 рублей (20 базовых величин) | 230 рублей (50% начальной цены предмета аукциона |
| озеро Болецкое | 6 км на северо-восток от г. Городка, у дер. Новый Болецк, 26,0 га | 203 кг, 91 кг | 460 рублей (20 базовых величин) | 230 рублей (50% начальной цены предмета аукциона |
| озеро Черново | 13 км на северо-запад от г. Городка у дер. Лыска, 325,0 га | 5800 кг, 1300 кг | 460 рублей (20 базовых величин) | 230 рублей (50% начальной цены предмета аукциона |
| озеро Кашо | 4 км на северо-запад от г. Городка дер. Большое Кашо, 411,0 га | 7600 кг, 1700 кг | 460 рублей (20 базовых величин) | 230 рублей (50% начальной цены предмета аукциона |

* Примечание: оплата производится в белорусских рублях исходя из размера базовой величины, установленной на день оплаты.

Организатор – Городокский районный исполнительный комитет, 211573, Витебская область, г. Городок, ул. Пролетарская, 2, контактный телефон 8(02139)43105, факс (802139)41005.

Для участия в аукционе приглашаются юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь.

Участникам необходимо в адрес организатора предоставить:

заявление с указанием, на какой территории и какие виды диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, предполагается заготавливать и (или) закупать по результатам торгов;

копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий счет организатора аукциона, заверенную банком;

юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателям, – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

представителям юридических лиц или индивидуальных предпринимателей предоставить доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя, а руководителям юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Документы, необходимые для участия в аукционе, принимаются организатором аукциона по адресу: 211573, Витебская область, г. Городок, ул. Пролетарская, 2, каб. 205, 109 (с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 по рабочим дням: понедельник–пятница).

Последний день приема документов – 5 июня 2017 года до 17.00.

Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет ГУ Министерства финансов Республики Беларусь по Витебской области №3600316007107 в филиале №200 Витебского облуправления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 150801635, УНП 300594330, код платежа в бюджет 04005. Порядок внесения задатка – единовременно.

Аукцион проводится в соответствии с Правилами добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, утвержденных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. №699.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Задатки участникам, не ставшим победителями, возвращаются в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Участнику, выигравшему торги, сумма внесенного задатка учитывается в счет возмещения затрат на организацию и проведение торгов, изготовление документации необходимой для их проведения.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведение аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан:

подписать протокол аукциона;

не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, а также оплатить приобретаемый предмет аукциона путем перечисления денежных средств на расчетный счет организатора аукциона до принятия решения Городокского районного Совета депутатов.

Для участника, ставшего победителем аукциона, при осуществлении заготовки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства (длиннопалого (узкопалого) рака, способом добычи диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства (длиннопалого (узкопалого) рака), является только использование раколовок как орудия добычи таких животных.